**УДК 392:273.2(476.5)**

# СТАРАВЕРЫ ЗАХОДНІХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ У 1920 – 1930-я гг.: СПЕЦЫФІКА РАССЯЛЕННЯ І ДЫНАМІКА КОЛЬКАСЦІ

***канд. гіст. навук, дацэнт У.Я. АЎСЕЙЧЫК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-6433-0039***

*У артыкуле разгледжаны асаблівасці рассялення і прадстаўлены аналіз дынамікі колькасці стараверскага насельніцтва ў 1920 – 1930-х гг. на заходнебеларускіх землях, якія ў гэты час знаходзіліся ў складзе Польшчы. Міжваенны перыяд у польскай дзяржаве быў даволі спрыяльным для развіцця стараверскай супольнасці, значная частка якой якраз і пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У артыкуле вылучаны асноўныя месцы кампактнага рассялення старавераў у рэгіёне, прасочана дынаміка іх колькасці па асобных адміністратыўных адзінках. Крыніцазнаўчую базу даследавання склаў комплекс статыстычных даных, архіўных і апублікаваных матэрыялаў. Прыходзім да высновы, што ў міжваенны перыяд амаль усё стараверскае насельніцтва Заходняй Беларусі было сканцэнтравана ў паўночнай яе частцы (у адпаведнасці з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам таго часу гэта тэрыторыя Віленскай зямлі, пазней – Віленскага ваяводства). Лідарамі па колькасці стараверскага насельніцтва былі Браслаўскі, Дзісенскі і Свянцянскі паветы. На працягу ўсяго перыяда ў рэгіёне назіраецца ўстойлівае павелічэнне стараверскага насельніцтва, а таксама рост рэлігійных абшчын. У 1920 – 1930-х гг. рэгіён з’яўляўся важным цэнтрам стараверства на беларускіх землях.*

***Ключавыя словы:*** *староверы, этнічныя групы, Заходняя Беларусь, рассяленне, дэмаграфія, этнакультурныя працэсы.*

**Уводзіны.** Адна з асноўных зон кампактнага рассялення старавераў на Беларусі лакалізуецца ў паўночна-заходняй яе частцы [1]. Стараверскае насельніцтва пачынае перасяляцца на гэтыя тэрыторыі яшчэ з сярэдзіны XVII ст. На працягу наступных стагоддзяў рэгіён адыгрывае істотную ролю ў развіцці стараверства не толькі на беларускіх землях, але і ўвогуле ва Усходняй Еўропе. Ён з’ўляецца адным з асноўных цэнтраў стараверства на беларускіх землях і ў сучасны перыяд: менавіта ў паўночна-заходняй частцы Беларусі знаходзіцца большасць стараверскіх абшчын у наш час.

Нягледзячы на гэта, гісторыя і культурныя традыцыі старавераў заходняга Падзвіння даследаваны дастаткова фрагментарна [2]. Калі яшчэ па гісторыі старавераў рэгіёна XVIII – пачатку XX ст. можна знайсці некаторую інфармацыю ў шэрагу дарэвалюцыйных публікацый (працы П.І. Карэцкага [3], А.А. Станкевіча [4]), манаграфіі А.А. Гарбацкага [5], даследаваннях літоўскага вучонага Г.У. Паташанкі [6], то іх гісторыя ў XX – пачатку XXI ст. вывучана слаба. Абдзялілі ўвагай навукоўцы і перыяд 1920 – 1930-х гг. – адзін з самых спрыяльных этапаў у развіцці стараверскай супольнасці на гэтых землях. У айчыннай і замежнай навуцы адсутнічаюць комплексныя работы аб старaверах на заходнебеларускіх землях у міжваенныя гады. У той жа час некаторыя аспекты з гісторыі і культуры гэтай этнаканфесійнай групы былі прадстаўлены ў шэрагу публікацый. Так, сціслую інфармацыю аб асаблівасцях рассялення і традыцыйнай культуры старавераў Браслаўшчыны ў міжваенны перыяд знаходзім у даследаванні О. Хедэмана [7]. Этнограф М. Пецюкевіч падрыхтаваў комплексную работу аб традыцыйных рамёствах старавераў Браслаўскага павету [8]. Асобныя аспекты гісторыі і традыцыйнай культуры старавераў Заходняй Беларусі даследавала Т.В. Дабжынская (Трафімава) [9; 10; 11]. Аналізам дзейнасці рускіх арганізацый у Польшчы ў 1921–1939 гг. у сферы культуры займалася В.Р. Швайко [12]. Характарыстыку культурнай і асветніцкай дзейнасці старавераў у Заходняй Беларусі ў 1920 – 1930-я гг. прадставіў А.М. Вабішчэвіч у артыкуле “Грамадска-культурная і рэлігійна-асветніцкая дзейнасць рускіх стараабраднікаў у Польшчы ў 1920 – 1930-я гады” [13]. А ў артыкуле “Старообрядцы как этноконфессиональное меньшинство в Польше (1918–1939 гг.)” даследчык засяродзіў увагу на становішчы старавераў у Польшчы ў міжваенны перыяд [14]. Некаторыя аспекты гісторыі і культуры старавераў Заходняй Беларусі былі разгледжаны і замежнымі вучонымі. Так, польская даследчыца І. Янушэўска-Юркевіч (J. Januszewska-Jurkiewicz) у манаграфіі “Нацыянальныя адносіны ў Віленскім краі ў 1920–1939 гг. ” (2010) [15] разгледзела стараверскую супольнасць у рэгіёне. Асноўная ўвага даследчыцы была засяроджана на аналізе ўдзелу стараверскага насельніцтва ў палітычным жыцці краіны. Яна таксама ахарактарызавала гаспадарчую дзейнасць старавераў, прывяла некаторыя статыстычныя даныя. Яшчэ адзін польскі навукоўца С. Пастушэўскі (S. Pastuszewski) прадставіў агульныя рысы развіцця старавераў на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд [16].

Такім чынам, як вынікае з гістарыяграфічнага аналізу, многія аспекты гісторыі і культуры старавераў Заходняй Беларусі міжваеннага часу так і не былі даследаваны. Сярод важнейшых пытанняў, якія патрабуюць першачарговай увагі, – выяўленне асаблівасцей рассялення старавераў у межах рэгіёна, а таксама аналіз дынамікі іх колькасці. Дадзены артыкул якраз і скіраваны на вырашэнне гэтых задач.

Храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць 1920 – 1930-я гг. Гэты перыяд лічыцца дастаткова спрыяльным ў развіцці стараверскай супольнасці ў паўночна-заходняй частцы Беларусі. У якасці рэгіёна даследавання

абрана тэрыторыя Заходняй Беларусі, якая ў адзначаны перыяд знаходзілася ў складзе Польшчы. Выходзячы з асаблівасцей рассялення старавераў на гэтых землях, тэрытарыяльныя межы даследавання будуць ахопліваюць толькі паўночную частку рэгіёна. У адпаведнасці з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам 1920 – 1930-х гг. у рэгіён даследавання будуць уваходзіць беларускія землі Віленскага ваяводства (да 1925 г. мела назву Віленская зямля). Крыніцамі даследавання стаў комплекс статыстычных даных, архіўных і апублікаваных матэрыялаў.

**Асноўная частка.** Найбольш раннія звесткі аб колькасці стараабрадцаў у заходняй і цэнтральнай Беларусі пасля Першай сусветнай вайны дае перапіс насельніцтва, праведзены ў снежні 1919 г. на т.зв. "усходніх землях Польшчы". Гэтыя тэрыторыі ў той час знаходзіліся пад кіраўніцтвам Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх земляў (Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich). Беларускія землі былі ўключаны ў тры акругі: Віленскую (Віленскі, Троцкі, Ашмянскі, Свянцянскі, Лідскі, Гродзенскі, Навагрудскі, Браслаўскі, Дзісенскі паветы), Брэсцкую (Брэсцкі, Ваўкавыскі, Пружанскі, Слонімскі, Кобрынскі, Пінскі, Мазырскі паветы), Мінскую (Мінскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Слуцкі і Ігуменскі паветы) (малюнак 1). Адной з галоўных задач ГУУЗ была падрыхтоўка да ўсталявання польскай дзяржаўнасці на падкантрольных тэрыторыях, а для вырашэння дадзенай задачы неабходным лічылася вызначэнне структуры насельніцтва, якое там пражывала [17, s. 64]. Па гэтай прычыне і быў праведзены перапіс насельніцтва на гэтых землях. Некаторыя яго даныя былі апублікаваны яшчэ ў 1920 г. [18], але большасць захоўваецца ў архівах. Шэраг матэрыялаў перапісу знаходзіцца ў Цэнтральнай статыстычнай бібліятэцы ў Варшаве (Centralna Biblioteka Statystyczna) [19; 29]. Пры аналізе даных перапісу трэба мець на ўвазе, што яшчэ ў 1920-я гг. навукоўцы звярталі ўвагу на пэўную фармальнасць пры яго правядзенні. Аднак у асноўным гэтыя заўвагі датычыліся вызначэння этнічнай прыналежнасці насельніцтва, а не канфесійнай [17, s. 73–74].




**Малюнак 1. – Адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел беларускіх земляў, падначаленых ГУУЗ (1919 – 1920 гг.)**

Як вынікае з даных перапісу 1919 г., у межах Віленскай, Брэсцкай і Мінскай акруг налічвалася 33 018 стараабрадцаў, што складала каля 0,85% ад усяго насельніцтва гэтых трох акруг (табліца 1).

Табліца 1. – Размеркаванне стараверскага насельніцтва на тэрыторыі, падначаленай Грамадзянскаму ўпраўленню Усходніх земляў (1919 г.)

| Акруга | Колькасць стараабрадцаў, чал. | Доля ад усяго насельніцтва акругі, % |
|---|---|---|
| Віленская | 27 224[1] | 1,67 |
| Мінская | 5 768 | 0,53 |
| Брэсцкая | 26 | – |

*Крыніца:* складзена аўтарам на аснове [19].

[1] Даныя, якія апублікаваў Е. Ромэр па выніках перапісу, некалькі адрозніваюцца. Ён налічыў у Віленскай акрузе 26 698 стараабрадцаў [18, s. 30].

З прыведзеных даных бачна, што амаль усё стараверскае насельніцтва пражывала ў межах Віленскай і Мінскай акруг. У Брэсцкай акрузе стараверы былі зафіксаваны толькі ў Мазырскім (19 чал.), Баранавіцкім (3 чал.) і Брэсцкім (4 чал.) паветах [19]. Віленская акруга з'яўлялася лідарам па колькасці стараверскага насельніцтва. У табліцы 2 прадстаўлена яго размеркаванне па паветах акругі.

Табліца 2. – Размеркаванне стараверскага насельніцтва па паветах Віленскай акругі (1919 г.)

| Павет | Колькасць, чал. | Доля ад усяго насельніцтва павета, % |
|---|---|---|
| Браслаўскі | 9 346 | 11,33 |
| Дзісенскі | 9 043 | 4,68 |
| Свянцянскі | 4 930 | 3,53 |
| Віленскі | 1 636 | 0,89 |
| Г. Вільня | 378 | 0,29 |
| Вілейскі | 894 | 0,42 |
| Лідскі | 526 | 0,28 |
| Троцкі | 323 | 0,35 |
| Ашмянскі | 140 | 0,07 |
| Гродзенскі | 8 | – |
| Навагрудскі | – | – |

*Крыніца:* складзена аўтарам на аснове [19].

На тэрыторыі Віленскай акругі найбольшая колькасць старавераў была зафіксавана ў Браслаўскім і Дзісенскім паветах. Браслаўскі павет быў утвораны з часткі былога Новаалександраўскага павета Ковенскай губерні і Ілукштанскага павета Курляндскай губерні, а таму значная яго частка не ўваходзіць у сучасныя межы Беларусі. У 1920 г. тэрыторыі былога Ілукштанскага павета былі перададзены ў склад Латвіі. Акрамя таго, не ўсе землі былога Новаалександраўскага павета з'яўляюцца ў сучасны перыяд беларускімі (тэрыторыі Дукшсцкай, Смолваўскай, Рымшанскай гмін знаходзяцца ў складзе Літвы). Уласна з усяго Браслаўскага павета да сучасных беларускіх тэрыторый адносяцца Браслаўская, Відзаўская, Дрысвяцкая, Опсаўская, Плюская і Слабодкаўская гміны. З падлікаў вынікае, што на беларускія землі прыпадала каля 40% ад усёй колькасці старавераў Браслаўскага павета. Згодна з перапісам 1919 г. гэта лічба не перавышала 4 тыс. чалавек. У агульным складзе насельніцтва найбольшая доля старавераў налічвалася ў Плюскай, Слабодкаўскай і Дрысвяцкай гмінах (табліца 3). Па колькасці стараверскага насельніцтва гэтыя гміны таксама лідзіравалі (бяручы да ўвагі толькі сучасныя беларускія землі). Найменшая колькасць старавераў пражывала ў гмінах Опса і Браслаў [18, s. 37].

Табліца 3. – Колькасць стараверскага насельніцтва ў гмінах Браслаўскага павета (1919 г.)

| Гміна | Колькасць насельніцтва, чал. | Доля старавераў, % |
|---|---|---|
| Браслаўская | 10 538 | 2,4 |
| Відзаўская | 7 360 | 7,2 |
| Дрысвяцкая | 5 078 | 12,2 |
| Опсаўская | 7 695 | 3,9 |
| Плюская | 5 644 | 20,0 |
| Слабодкаўская | 9 018 | 10,2 |

*Крыніца:* складзена на аснове [18, s. 37].

Згодна з данымі перапісу 1919 г. лідарам па колькасці старавераў на беларускіх землях быў Дзісенскі павет. Найбольшая колькасць прыхільнікаў старых абрадаў на яго тэрыторыі пражывала ў Перабродзскай гміне, тут налічвалася каля 3 тыс. старавераў, што складала 36,9% ад усяго насельніцтва гміны. Істотная колькасць таксама зафіксавана ў Ёдскай (каля 1,5 тыс. чалавек і 11,6% ад усяго насельніцтва), Нова-Пагосцкай (каля 1,3 тыс. чалавек і 15,4% ад усяго насельніцтва), Богінскай (каля 0,8 тыс. чалавек і 9,2% ад усяго насельніцтва), Друйскай (каля 0,65 тыс. чалавек, 7,6% ад усяго насельніцтва), Германавіцкай (каля 0,45 тыс. чалавек, 5,8% ад усяго насельніцтва) гмінах [18, s. 38].

Істотная доля старавераў зафіксавана ў Свянцянскім павеце. Але толькі ў Гадуцішскай (большая яе частка не адносіцца ў сучасны перыяд да беларускіх земляў), Камайскай, Лынтупскай і Свірскай гмінах іх доля ў агульнай структуры насельніцтва была істотнай (бяручы да ўвагі толькі сучасныя беларускія землі). А ў Вілейскім павеце стараверы пражывалі амаль выключна ў Лучайскай, Манькавіцкай (тэрыторыя сучаснага Пастаўскага р-на) і Хоценчыцкай гмінах (сучасны Вілейскі р-н), але іх колькасць не была вялікай [18, s. 38, 41; 21, № 8].

Больш дакладную, поўную і сістэмную інфармацыю аб колькасці стараверскага насельніцтва, асаблівасцях яго рассялення на тэрыторыі Заходняй Беларусі даюць матэрыялы перапісу 1921 г. Даныя аб стараверскім насельніцтве ў паветах Заходняй Беларусі, згодна з перапісам 1921 г., прадстаўлены ў табліцы 4. Пры гэтым трэба адзначыць, што матэрыялы перапісу няпоўна прадстаўляюць дэмаграфічную характарыстыку старавераў на паўночна-заходніх землях Беларусі. Частку Віленшчыны гэты перапіс не ахапіў. Акрамя таго, у навукоўцаў узнікаюць сур'ёзныя сумненні да дастаўернасці даных, атрыманых у ходзе перапісу.

Табліца 4. – Размеркаванне стараверскага насельніцтва па беларускіх паветах Віленскай зямлі, Навагрудскага, Палесскага і Беластоцкага ваяводстваў (згодна з перапісам 1921 г.)

| Павет | Колькасць старавераў, чал. | Доля старавераў, % |
|---|---|---|
| *Віленская зямля* | | |
| Дзісенскі | 9 638 | 5,57 |
| Браслаўскі | 5 482 | 8,75 |
| Дунілавіцкі | 719 | 0,64 |
| Вілейскі | 178 | 0,14 |
| Свянцянскі | Перапіс не праводзіўся | |
| Ашмянскі | | |
| *Навагрудскае ваяводства* | | |
| Баранавіцкі | 67 | 0,06 |
| Лідскі | 21 | 0,01 |
| Валожынскі | 5 | – |
| Навагрудскі | 4 | – |
| Стаўбцоўскі | 2 | – |
| Несвіжскі | 1 | – |
| Слонімскі | – | – |
| *Палескае ваяводства* | | |
| Лунінецкі | 16 | – |
| Брэсцкі | 2 | – |
| Пінскі | 1 | – |
| Драгічынскі | – | – |
| Кобрынскі | – | – |
| Косаўскі | – | – |
| Пружанскі | – | – |
| *Беластоцкае ваяводства* | | |
| Гродзенскі | 16 | – |
| Ваўкавыскі | – | – |

*Крыніцы:* складзена на аснове: [22, s. VI; 23, s. X; 24, s. X; 25, s. X].

Як бачна з прыведзеных даных, асноўная колькасць старавераў пражывала на тэрыторыі Віленскай зямлі (пазней – Віленскага ваяводства). На іншых беларускіх тэрыторыях, якія ўваходзілі ў склад Польшчы, у пачатку 1920-х гг. прыхільнікаў старых абрадаў пражывала мала. У Навагрудскім ваяводстве зафіксавана толькі 100 чалавек. Пераважная іх колькасць месцілася ў Баранавіцкім і Лідскім паветах (гл. табліцу 4). На тэрыторыі Палескага ваяводства старавераў налічвалася яшчэ менш. На беларускіх землях ваяводства зафіксаваны толькі 19 чалавек (гл. табліцу 4). З іх 17 пражывала ў гарадах (у Лунінцы – 15, Брэсце – 2) [24, s. X]. У беларускіх паветах Беластоцкай губерні старавераў амаль не налічвалася: толькі ў Гродзенскім павеце пражывала 16 чалавек (гл. табліцу 4).

У 1931 г. быў апублікаваны дадатак у выглядзе 12 карт да выдання “Wilno i Ziemia Wileńska” [21]. Сярод іх была і карта рассялення стараверскага насельніцтва ў Віленскім ваяводстве (малюнак 2). Яе аўтарам з’яўляецца Януш Астроўскі. Карта складзена на аснове даных перапісу насельніцтва ў 1921 г., а для тэрыторый, якія ўваходзілі ў Сярэднюю Літву – на аснове перапісу 1919 г. Адміністратыўны падзел на гэтай карце быў прыведзены па стану на 1930 г. На карце паказана доля старавераў ў агульнай колькасці хрысціянскага насельніцтва кожнай з гмін Віленскага ваяводства. Падлікі праведзены без уліку насельніцтва гарадоў [26, s. 146–147], а таму рэальная доля старавераў у агульнай структуры насельніцтва гмін (разам з гарадскім і нехрысціянскім насельніцтвам) была значна меншай, чым гэта паказана на карце.

Лідарам па колькасці стараверскага насельніцтва на тэрыторыі Віленскай зямлі быў Дзісенскі павет. У агульнай структуры его насельніцтва прыхільнікі старых абрадаў складалі 5,57% (гл. табліцу 4). Колькасцю старавераў у павеце асабліва вылучалася Перабродзская гміна. На яе тэрыторыі, як вынікае з матэрыялаў перапісу 1921 г., пражывала 3 122 старавераў, што складала 38,18% ад усяго насельніцтва. Стараверскае насельніцтва фіксавалася больш чым у палове яе населеных пунктаў. Лідарамі па колькасці старавераў вылучаліся наступныя: в. Мацяшы (238 старавераў), в. Ніўнікі (226), в. Рудава (196), в. Маляўкі (162), в. Буеўшчына (152), в. Кублішчына (147), в. Запалоссе (130), в. Гайляшы (116), в. Зачарэўе (102), калоніі Іказнь (115) і Калеснікі (104). Значная колькасць старавераў была зафіксавана таксама ў паўночнай і заходняй частках Дзісенскага павета (Ёдская, Нова-Пагосцкая, Богінская, Друеўская, Германавіцкая, Чэрасаўская, Шаркаўшчынская гміны). Ва ўсходніх і паўднёвых землях павета прыхільнікаў старых абрадаў пражывала мала. На гэтай тэрыторыі параўнальна невялікая іх колькасць зафіксавана ў Залескай, Глыбоцкай і Пліскай гмінах. Аднак колькасць населеных пунктаў, дзе яны налічваліся, была зусім малой. Так, у Залескай гміне большая частка старавераў пражывала ў в. Залессе (212 з 307 чалавек). А з 232 прадстаўнікоў старога абраду, якія налічваліся ў Глыбоцкай гміне, 159 чалавек пражывала ў в. Ластавічы. Невялікая колькасць старавераў пражывала ў Лужкоўскай, Мікалаеўскай, Стэфанпольскай і Мёрскай гмінах [22, s. 39–76]. Асноўная маса старавераў павета пражывала ў сельскай мясцовасці. У той жа час у вялікіх населеных пунктах павета старавераў налічвалася вельмі мала. Так, у Дзісне пражывала толькі 10 старавераў, а ў Глыбокім – 13. Пры гэтым у мяст. Друя на 1921 г. налічвалася 207 старавераў [22, s. 39].




**Малюнак 2. – Карта рассялення стараавераў на тэрыторыі Віленскай зямлі паводле перапісаў насельніцтва 1919 і 1921 г. (складзена Я. Астроўскім)**

Істотная колькасць стараавераў зафіксавана ў Браслаўскім павеце. На яго тэрыторыі у 1921 г. пражывала звыш 5 тыс. чалавек, што складала 8,75% ад мясцовага насельніцтва. Матэрыялы перапісу сведчаць аб тым, што прыхільнікі старых абрадаў пражывалі ва ўсіх яго гмінах. На беларускіх землях павета лідарамі па колькасці стараавераў былі Плюская, Відзаўская, Слабодкаўская і Дрысвяцкая гміны. Па долі стараавераў у агульнай структуры насельніцтва Браслаўскага павета гэтыя гміны займалі лідыруючыя пазіцыі. Асабліва вылучалася Плюская гміна. Згодна з перапісам 1921 г. у агульнай структуры яе насельніцтва стараверы складалі 20,92%. У Відзаўскай, Дрысвяцкай і Слабодкаўскай гмінах доля іх была ніжэйшай. Так, у Дрысвяцкай гміне яны складалі 13,29% ад усяго насельніцтва, у Відзаўскай –12,02%, у Слабодкаўскай – 9,78%. У астатніх беларускіх гмінах павета колькасць стараавераў была яшчэ меншай. Так, у Опсаўскай гміне яны складалі 4,03% ад усяго насельніцтва, а ў Браслаўскай гміне – толькі 2,69% [22, s. 3–20]. У гмінах, тэрыторыя якіх не адносіцца да сучаснай Беларусі, стараавераў пражывала няшмат [22, s.7–14]. Як і ў Дзісенскім павеце, пераважная колькасць стараавераў сялілася ў сельскай мясцовасці. Іх колькасць у мяст. Браслаў была малой (11 чалавек). Толькі ў мяст. Відзы колькасць стараверскага насельніцтва была больш істотнай і ў 1921 г. дасягнула 200 чалавек [22, s.7–19]. Сярод лідараў па колькасці стараавераў у павеце былі наступныя населеныя пункты: в. Кірыліна (212), калонія Крываселле (180), в. Красна-горка (155), в. Рымуці (154), в. Мікалаюнцы (150), в. Шашкішкі (135), в. Булавішкі (134) [22, s. 3–20].

У пачатку 1920-х гг. Дунілавіцкі і Вілейскі паветы не з’яўляліся лідарамі па колькасці стараавераў: на 1921 г. іх доля ў агульнай структуры насельніцтва была невялікай (0,64% – у Дунілавіцкім, 0,14% – у Вілейскім). Па колькасці стараверы саступалі каталікам, праваслаўным і іўдзеям. У Дунілавіцкім павеце стараверы пражывалі амаль выключна ў Лучайскай, Манькавіцкай, Мядзельскай і Пастаўскай гмінах. У Вілейскім павеце стараверскае насельніцтва зафіксавана толькі ў Хоценчыцкай, Іллінскай, Маладзечанскай і Алковіцкай гмінах, але іх колькасць і тут была нязначнай [22, s. 78–94].

Для больш нагляднай карціны і выяўлення асаблівасцей рассялення стараавераў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг. была складзена карта-схема (малюнак 3), падрыхтаваная на аснове даных перапісу

1921 г., архіўных і апублікаваных крыніц. На ёй пазначаны населеныя пункты, дзе пражывалі стараверы[2]. Паколькі амаль усё стараверскае насельніцтва пражывала ў межах Віленскай зямлі, то і на карце пазначаны толькі гэты рэгіён. Як сведчаць даныя перапісу 1921 г., а таксама іншыя статыстычныя і архіўныя даныя, у беларускіх паветах Навагрудскага, Палескага і Беластоцкага ваяводстваў месцаў кампактнага рассялення старавераў не было.




**Малюнак 3. – Карта-схема рассялення старавераў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў пачатку 1920-х гг. (складзена аўтарам)**

Як бачна на карце, асноўныя арэалы стараверскіх пасяленняў рэгіёна былі сканцэнтраваны на тэрыторыі Дзісенскага і Браслаўскага паветаў. Пры гэтым у паўночна-ўсходняй і паўднёвай частках Дзісенскага павета стараверскіх пасяленняў амаль не налічвалася. Стараверы насялялі тэрыторыю павета на поўнач ад ракі Дзісна, на поўдзень ад ракі іх амаль не налічвалася (толькі пасяленні ў ваколіцах вв. Залессе і Ластавічы на тэрыторыі сучаснага Глыбоцкага р-на). У межах Свянцянскага павета існавалі тры арэалы рассялення старавераў. Першы займаў паўночна-заходнюю частку сучаснага Пастаўскага раёна, яго цэнтрамі былі в. Апідамы і в. Кукляны. Яшчэ адзін з іх ахопліваў рэгіён у ваколіцах вв. Стрыпішкі, Ляшчынава, Грэчанішкі, Зароўе і інш. (знаходзіцца на самым поўначы Астравецкага р-на Гродзенскай вобл.) і пераходзіў на сучасныя літоўскія землі. Цэнтрам яшчэ аднаго было мяст. Свір (у сучасны перыяд пасёлак у Мядзельскім раёне Мінскай вобласці). У Дунілавіцкім павеце зафіксаваны два невялікія арэалы з цэнтрамі ў в. Захараўшчына і калоніі Лучай. Невялікія арэалы таксама існавалі ў Ашмянскім і Вілейскім паветах. Аналізуючы асаблівасці рассялення старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў 1920-я гг., неабходна адзначыць той факт, што агульная структура арэалаў рассялення засталася такой жа, як і ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [1].

На працягу 1920-х гг. стараверы Віленшчыны ўяўлялі сабой дынамічна развіваючуюся супольнасць. У немалой ступені гэтаму спрыяла дзяржаўная палітыка польскіх улад: у заканадаўчым плане стараверы не былі абмежаванай групай, яны атрымалі ўсе канстытуцыйныя гарантыі этнічнага і канфесійнага характару. Гэта ў немалой ступені адбілася на дэмаграфічных працэсах у асяроддзі старавераў. На тэрыторыі Віленскай зямлі ў 1923 г. было зафіксавана 30 стараверскіх абшчын, кожная з якіх аб'ядноўвала ад 500 да 2000 прыхажан: у Вільні – 1, у Свянцянскім павеце – 9, у Браслаўскім – 5, у Дзісенскім – 10, у Дунілавіцкім – 2, у Ашмянскім – 1, у Віленска-Троцкім – 2 [27, s. 266]. На працягу першай паловы 1920-х гг. адзначаецца некаторае павелічэнне колькасці старавераў у гэтых паветах. Так, на 1924 г. у Віленскай зямлі пражывала 28 808 прадстаўнікоў культа, у Дзісенскім павеце – 9 738, Браслаўскім – 5 562, Свянцянскім – 6 829, Дунілавіцкім – 760, Вілейскім – 188 [15, s. 456].

[2] На карце пазначаны толькі тыя населеныя пункты, дзе колькасць стараверскага насельніцтва перавышала 10 чалавек.

У навуковай літаратуры часам сустракаецца інфармацыя аб значна большай колькасці стравераў на тэрыторыі Віленскай зямлі ў 1920-х гг. Даволі часта [13, с. 105; 14, с. 165; 27, s. 266] сустракаецца лічба ў 60 тыс. чалавек, г.зн. удвая большая чым афіцыйна зафіксавана. Патлумачыць такую колькасць можна даволі прыблізнымі падлікамі, якія ажыццяўляліся ў гэты перыяд. Па ўсёй верагоднасці, такая колькасць стараверaў растыражавалася на аснове даных, што прадставіў у 1923 г. у адказ на запыт Міністэрства па справах рэлігій і народнай адукацыі сакратар стараверскай абшчыны ў Вільні, Барыс Піманаў. Паколькі значная доля інфармацыі аб колькасці стараверaў у Віленскай зямлі ў сярэдзіне 1920-х гг. паступала якраз ад саміх стараверaў, то прычыны тыражавання стануць зразумелымі. Так, у інфармацыі, якая падавалася Б. Піманавым, гаворка ішла пра дапушчэнне колькасці стараверaў на тэрыторыі Віленскай зямлі да 60 тыс., але ў дакуменце гаворка вялася пра 30 абшчын, да якіх належала ад 500 да 2000 прыхажан [27, s. 266, s. 269]. Таму такая лічба атрымалася ад матэматычных падлікаў, а не рэальных даных (30 абшчын × 2 тыс. = 60 тыс.). За ўвесь міжваенны перыяд, як сведчаць статыстычныя даныя, колькасць стараверaў Віленскага ваяводства не дасягала 60 тыс. чалавек.

У Віленскім ваяводстве ў 1920–1930-х гг. пражывалі амаль выключна стараверы-беспапоўцы [27, s. 266]. У 1930-х гг. налічвалася толькі адна абшчына стараверaў-папоўцаў. Яна знаходзілася ў Віленска-Троцкім павеце ў Падбярэзскай гміне (в. Акмяна) і налічвала ў 1936 г. 46 асоб. Таксама 18 стараверaў-папоўцаў пражывала ў Свянцянскім павеце (в. Зусіна і Геладня), 31 асоба – у Вільні [28, s. 67].

Апроч паветаў Віленскага ваяводства, на іншых землях Заходняй Беларусі стараверaў на працягу 1920-х гг. амаль не налічвалася (як і па даных перапісу 1921 г.). Так, кіраўніцтва Навагрудскага ваяводства ў 1923 г. у адпаведнасці з рэскрыптам паведамляла ў міністэрства, што на тэрыторыі ваяводства прадстаўнікоў культа амаль няма, за выключэннем некалькіх дзясяткаў сем’яў у Слонімскім павеце і некалькіх у Баранавіцкім павеце [27, s. 264]. А кіраўніцтва Беластоцкага ваяводства ў адпаведнасці з рэскрыптам паведамляла ў міністэрства, што ў Гродне і павеце “секты стараверaў увогуле няма” [27, s. 264].

Тэндэнцыі да павелічэння стараверскага насельніцтва ў рэгіёне захоўваліся і ў другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гг. Поўную інфармацыю аб колькасці стараверaў і месцах іх рассялення даюць даныя перапісу 1931 г. (табліца 5). Дакладна вызначыць колькасць стараверaў на сучасных беларускіх земляў на аснове апублікаваных даных гэтага перапісу даволі праблематычна ў сувязі з некалькімі прычынамі. Па-першае, невялікая частка Браслаўскага павета, а таксама значная частка Свянцянскага павета ў сучасны перыяд уваходзіць у склад Літвы. Па-другое, у апублікаваных даных перапісу інфармацыя аб стараверах прыведзена ў графе “іншыя хрысціянскія веравызнанні”. Праўда, як адзначалі даследчыкі, якія апрацоўвалі інфармацыю перапісу, у Віленскім ваяводстве да гэтай групы адносіліся пераважна стараверы [29, s. XI].

Як вынікае з даных перапісу 1931 г., лідарам па колькасці стараверскага насельніцтва ў Віленскім ваяводстве стаў Браслаўскі павет. На яго тэрыторыі пражывала больш паловы ўсіх стараверaў беларускіх паветаў ваяводства (гл. табліцу 5). Такое хуткае павелічэнне стараверскага насельніцтва тлумачыцца не міграцыйяй ці іншымі дэмаграфічнымі працэсамі, а пераразмеркаваннем тэрыторый паветаў у выніку адміністратыўна-тэрытарыяльнай рэформы. Згодна з распараджэннем Рады міністраў ад 26 чэрвеня 1925 г. значная частка былога Дзісенскага павета (Перабродзская, Богінская, Ёдская, Нова-Пагосцкая, Друйская, Мёрская, Леонпальская, Чэрасская гміны) была перададзена ў склад Браслаўскага [30, poz. 472]. Менавіта Перабродзская, Богінская, Ёдская, Нова-Пагосцкая гміны былі лідарамі па колькасці стараверскага насельніцтва ў Дзісенскім павеце. У выніку колькасць стараверaў у Дзісенскім значна паменшылася, а ў Браслаўскім – істотна ўзрасла. Другім па колькасці стараверaў у Віленскім ваяводстве стаў Свянцянскі павет. Істотна вырасла колькасць стараверaў і ў Пастаўскім павеце[3].

Табліца 5. – Размеркаванне насельніцтва “іншых хрысціянскіх веравызнанняў” па паветах Віленскага ваяводства згодна з перапісам 1931 г.

| Павет | Колькасць, чал. | Доля прадстаўнікоў “іншых хрысціянскіх веравызнанняў”, % |
|---|---|---|
| Браслаўскі | 16 183 | 11,3 |
| Свянцянскі | 8 687 | 6,37 |
| Дзісенскі | 2 174 | 1,36 |
| Пастаўскі | 1 568 | 1,57 |
| Ашмянскі | 757 | 0,72 |
| Вілейскі | 611 | 0,47 |
| Маладзечанскі | 215 | 0,18 |

*Крыніца:* складзена на аснове [29, s. 12].

Статыстычныя і архіўныя крыніцы сведчаць аб устойлівым павелічэнні стараверскага насельніцтва, а таксама колькасці іх абшчын у рэгіёне на працягу 1930-х гг. Так, згодна з данымі на 1936 г. у Віленскім ваяводстве пражывала звыш 40 тысяч стараверaў, якія ўтваралі 42 рэлігійныя абшчыны (табліца 6).

[3] Пастаўскі павет быў утвораны ў сувязі з перайменаваннем Дунілавіцкага павета і пераносам павятовага цэнтра у Паставы. У яго склад таксама былі перададзены тры гміны са Свянцянскага павета. А Будслаўская гміна была перададзена з Пастаўскага ў Вілейскі павет [30, poz. 472].

Табліца 6 – Статыстычныя даныя аб колькасці стараверскіх абшчын, храмаў, духавенства і прыхажан у Віленскім ваяводстве на 1936 г.[4] [27, s. 326]

| Павет | Колькасць абшчын | Колькасць храмаў | Колькасць духавенства | Колькасць прыхажанаў |
|---|---|---|---|---|
| Браслаўскі | 18 | 18 | 17 | 19 118 |
| Дзісенскі | 4 | 4 | 4 | 2 995 |
| Ашмянскі | 3 | 2 | 2 | 815 |
| Пастаўскі | 3 | 2 | 2 | 1 665 |
| Свянцянскі | 10 | 9 | 9 | 12 187 |
| Віленска-Троцкі | 3 | 3 | 3 | 1 963 |
| г. Вільна | 1 | 1 | 1 | 428 |
| **Усяго** | **42** | **39** | **38** | **42 777** |

Як вынікае з прыведзеных даных, пераважная большасць старавераў Віленскага ваяводства пражывала на беларускіх землях. У сучасных межах Беларусі на той час існавала 30 стараверскіх абшчын. Яны аб'ядноўвалі звыш 30 тыс. чалавек [27, s. 318–322, 326]. Геаграфія размяшчэння паказана на малюнку 4. Пры падліках стараверскага насельніцтва ў сучасных межах Беларусі пэўную цяжкасць выклікае дакладнае ўстанаўленне колькасці старавераў, якія пражывалі на беларускіх землях Свянцянскага павета. Як вынікае з даных, у 1936 г. на беларускіх землях павета існавалі 4 стараверскія абшчыны ў Апідамах, Куклянах, Стрыпішках і Свіры, колькасць прыхажан у якіх складала 6 009 чалавек (3 245 – Апідамы, 1 315 – Кукляны, 826 – Стрыпішкі, 623 – Свір) [27, s. 319–320].




**Малюнак 4. – Карта-схема размяшчэння стараверскіх абшчын на заходнебеларускіх землях у другой палове 1930-х гг. (складзена аўтарам)**

**Заключэнне.** Такім чынам, на аснове аналізу крыніц прыходзім да наступных высноў. У 1920 – 1930-х гг. у паўночна-заходняй частцы Беларусі пражывала значная колькасць стараверскага насельніцтва. У гэтым рэгіёне размяшчалася адна з найбуйнейшых кампактных зон рассялення старавераў на беларускіх землях. У азначаны перыяд рэгіён з'яўляўся адным з лідараў як па колькасці стараверскага насельніцтва, так і па колькасці іх рэлігійных абшчын. Асноўная маса старавераў пражывала на беларускіх землях Віленскага ваяводства (да 1925 г. мела назву Віленская зямля). У канцы 1930-х гг. на беларускіх землях Віленскага ваяводства налічвалася звыш 30 тысяч старавераў. Лідарамі па колькасці стараверскага насельніцтва ў ваяводстве былі Браслаўскі, Дзісенскі і Свянцянскі паветы. Асноўныя арэалы рассялення прыхільнікаў старых абрадаў канцэнтраваліся ў межах гэтых

[4] Як вынікае з архіўных дакументаў, прыведзеныя даныя хоць і падаюцца на 1937 г., але сабраныяў ў 1936 г. [26, s. 315, 318–322].

паветаў. Пераважная большасць старавераў рэгіёна пражывала ў сельскай мясцовасці. Толькі ў мястэчках Друя і Відзы налічвалася значная колькасць прыхільнікаў старых абрадаў. Аналізуючы асаблівасці рассялення старавераў у паўночна-заходняй частцы Беларусі ў 1920-я гг. прыходзім да высновы, што агульная структура арэалаў рассялення засталася такой жа, як і ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Дзякуючы дастаткова спрыяльным умовам для развіцця ў міжваенны перыяд у складзе Польскай дзяржавы, стараверская супольнасць рэгіёна заставалася на беларускіх землях дастаткова масавай і ў наступныя перыяды.

ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык, У.Я. Рассяленне і дэмаграфічная характарыстыка стараавераў паўночна-заходняй Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / У.Я. Аўсейчык // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2021. – Т. 13. – № 1. – С. 57–67.
2. Аўсейчык, У.Я. Гісторыя вывучэння стараавераў Паўночнай Беларусі / У.Я. Аўсейчык // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2020. – № 1. – С. 18–32.
3. Корецкий, П.И. О раскольниках в Ковенской губернии / П.И. Корецкий // Памятная книжка Ковенской губернии на 1863 год. – Ковно : Тип. Ш. Соколовского, 1863. – Отдел II. – С. 1–46.
4. Станкевич, А. Очерк возникновения русских поселений на Литве / А. Станкевич. – Вильна : Губ. тип., 1909. – 140 с.
5. Гарбацкі, А.А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А.А. Гарбацкі. – Брэст : БрДУ, 1999. – 202 с.
6. Поташенко, Г. Староверие в Литве: Вторая половина XVII – начало XIX вв. Исследования, документы, материалы / Г. Поташенко. – Вильнюс : Aidai, 2006. – 543 с.
7. Hedeman, O. Historja powiatu Brasławskiego / O. Hedeman. – Wilno : Polska Druk. Nakłądowa «Lux», 1930. – 434 s.
8. Pieciukiewicz, M. Cechy prymitywne w kulturze ludowej staroobrzedowcow w pow. Brasławskim: teza magisterska / M. Pieciukiewicz. – Wilno, 1938. – IV+66+6 s.
9. Добжинская, Т.В. Духовные старообрядческие наставники на Витебщине в первой половине XX в. / Т.В. Добжинская // Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2005. – № 1. – С. 12–15.
10. Трофимова, Т.В. Семейные обряды старообрядцев Витебщины в конце XIX – первой половине XX века / Т.В. Трофимова // Рэлігія на памежжы: еўрарэгіён «Буг» : зб. навук. пр. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст, 2008. – С. 81–89.
11. Добжинская, Т.В. Роль Высшего Старообрядческого Совета в Польше в довоенный период (1927 – 1929 гг.) / Т.В. Добжинская // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та імя П.М. Машэрава. – 2004. – № 2(32). – С. 38–41.
12. Швайко, В.Г. Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921 – 1939 годах : автореф. дис. … канд. ист. наук : 24.00.01 / В.Г. Швайко ; Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы. – Гродно, 2005. – 22 с.
13. Вабішчэвіч, А.М. Грамадска-культурная і рэлігійна-асветніцкая дзейнасць рускіх стараабраднікаў у Польшчы ў 1920 – 1930-я гады / А.М. Вабішчэвіч // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 101–108.
14. Вабищевич, А.Н. Старообрядцы как этноконфессиональное меньшинство в Польше (1918–1939 гг.) / А.Н. Вабищевич // Славянский альманах. – 2015. – Вып. 3–4. – С. 157–171.
15. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice : Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, 2010. – 710 s.
16. Pastuszewski, S. Staroobrzędowcy na ziemiach białoruskich / S. Pastuszewski // Roczniki Bialskopodlaski. – 2015. – T. XXIII. – S. 159–207.
17. Łazowska, B. Spis ludności na ziemiach wschodnich Rzeczypospolitej Polskiej w 1919 r. / B. Łazowska // Wiadomości Statystyczne. – 2019. – № 10. – S. 63–76.
18. Romer, E. Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919) / E. Romer. – Lwów-Warszawa : Książnica Polska Towarzystwa Nauczycieli Szkół Wyższych, 1920. – 50 s.
19. Grafik składu wyznaniowego narodowości i składu narodowościowego wyznań. [Электронны рэсурс]. Wilno : Komisariat Generalny ZCZW [Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich], Centralne Biuro Spisu Ludności [rękopis]. – 1920. – 28 tabl. URL: https://statlibr.stat.gov.pl/F?func=full-set-set&set_number=000008&set_entry=000001&format=999.
20. Grafik wyznaniowy i narodowościowy w procentach: okręgu: wileńskiego, brzeskiego, mińskiego łącznie z miastami, powiatów bez miast powiatowych, miast powiatowych; terenu objętego ZCZW [Zarządem Cywilnym Ziem Wschodnich]. [Электронны рэсурс]. Wilno: Centralne Biuro Spisu Ludności [rękopis]. – 1920. – 20 tabl. URL: https://statlibr.stat.gov.pl/F?func=find-b&request=Grafik+wyznaniowy+%5Bi%5D+narodowo%C5%9Bciowy&find_code=WRD&adjacent=N&local_base=CBS01&x=0&y=0&filter_code_1=WLN&filter_request_1=&filter_code_2=WYR&filter_request_2=&filter_code_3=WYR&filter_request_3=&filter_code_4=WFM&filter_request_4=&filter_code_5=WSL&filter_request_5=.
21. Wilno i Ziemia Wileńska: 12 map ilustrujących stosunki wyznaniowe, narodowościowe, szkolne i t. p. Województwa Wileńskiego / red. Zygmunt Hartung [et al.]. – Wilno : Lux, 1931. – 6+12 kart.
22. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : Nakladem glownego urzedu statystycznego, 1923. – T. 7. – Cz. 2: Ziemia wileńska (powiaty: Brasław, Duniłowicze, Dzisna i Wilejka). – VI, 119 s.
23. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : Nakladem glownego urzedu statystycznego, 1923. – T. 7. – Cz. 1: Województwo Nowogrodzkie. – X, 125 s.
24. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa: nakladem glownego urzedu statystycznego, 1924. – T. 8: Województwo Poleskie. – X, 84 s.
25. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników Pierwszego Powszechnego Spisu Ludności z dn. 30 września 1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : Nakladem glownego urzedu statystycznego, 1924. – T. 5: Województwo Białostockie. – VII, 150 s.

26. Polskie mapy narodowościowe, wyznaniowe i językowe : bibliografia (lata 1827-1967) / oprocowal A. Gawryszewski. – Warszawa : IGiPZ PAN, 1969. – 155 s.
27. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespół 14: Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. – Sygnatura 1270: Kościół Staroobrzędowy nieuznający hierarchii (1922–1939).
28. AAN. – Zespół 14: Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego w Warszawie. – Sygnatura 1272: Kościół Staroobrzędowy uznający hierarchię tzw. popowcy.
29. Drugi Powszechny Spis Ludności z dn. 9. XII 1931 r. : mieszkania i gospodarstwa domowe, ludność, stosunki zawodowe : województwo wileńskie. – Warszawa : Główny Urząd Statystyczny, 1936. – XXX, 164 s.
30. Rozporządzenie Rady Ministrów z dnia 26 czerwca 1925 r. o zmianie granic powiatów na obszarze okręgu administracyjnego wileńskiego // Dziennik Ustaw. – 1925. – № 67. – poz. 472.

*Пастурiў 14.12.2021*

## СТАРООБРЯДЦЫ ЗАПАДНЫХ БЕЛАРУСКИХ ЗЕМЕЛЬ В 1920 – 1930-е гг.: СПЕЦИФИКА РАССЕЛЕНИЯ И ДИНАМИКА ЧИСЛЕННОСТИ

***В.Е. ОВСЕЙЧИК***

*В статье рассмотрены особенности расселения и представлен анализ динамики численности старообрядческого населения в 1920 – 1930-х гг. на западнобелорусских землях, находящихся в этот период в составе Польши. Межвоенный период в польском государстве был достаточно благоприятным для развития старообрядческого сообщества, значительная часть которого как раз и проживала на территории Западной Беларуси. В статье выделены основные места компактного расселения староверов в регионе, прослежена динамика их количества по отдельным административным единицам. Источниковедческую базу исследования составил комплекс статистических данных, архивных и опубликованных материалов. Приходим к выводу, что в межвоенный период почти всё старообрядческое население Западной Беларуси было сконцентрировано в северной её части (в соответствии с административно-территориальным делением того времени, эта территория Виленской земли, позже – Виленского воеводства). Лидером по численности староверов были Браславский, Дисненский и Свентянский поветы. На протяжении всего периода в регионе наблюдается устойчивое увеличение количества старообрядческого населения, а также рост религиозных общин. В 1920 – 1930-х гг. регион являлся важным центром старообрядчества на белорусских землях.*

***Ключевые слова:*** *старообрядцы, этнические группы, Западная Беларусь, расселение, демография, этнокультурные процессы.*

## OLD BELIEVERS OF THE WESTERN BELARUSIAN LANDS IN 1920-1930S: SPECIFICS OF SETTLEMENT AND POPULATION DYNAMICS

***U. AUSEICHYK***

*The article covers the peculiarities of settlement and provides the analysis of the population dynamics of the Old Believers population in 1920–1930-ies in the Western Belarusian lands, which at that time were the part of Poland. The interwar period was rather favorable for the development of the Old Believer community in the Polish state. A significant part of Old Believers during this period lived on the territory of Western Belarus. The article singles out the main places of compact residence of Old Believers in the region and traces the dynamics of their numbers in separate administrative units. The sources for the study are a complex of statistical data, archival and published materials. We conclude that during the interwar period almost the entire Old Believer population of Western Belarus was concentrated in its northern part (in accordance with the administrative territorial division of that time this territory of Vilna Land, later – Vilna Voivodeship). The leaders in the number of the Old Believers' population were Braslav, Disna and Svientiany counties. Throughout the period there was a steady increase in the Old Believer population in the region, as well as the growth of their religious communities. In the 1920s and 1930s, the region was an important center of Old Believers in the Belarusian lands.*

***Keywords:*** *Old Believers, ethnic groups, Western Belarus, settlement, demography, ethno-cultural processes.*